Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА АДЗІНАЙ ГІДРА-МЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ

Адрас рэдакцыі: Менск, р. Карла Маркса і Чырвонаармейскай, 48, Галоўнае Кіраўніцтва АГМС БССР.

№ 10 (142) | 1—10 красавіка | 1934 г.

ЗМЕСТ

ПАСТАНОВА

агульнага сходу калектыва работнікаў ГК АГМС БССР па пытанню аб падпісцы на пазыку „2-й пяцігодкі“ (другі выпуск).

Заслухаўшы тав. Бугаева аб дасягненнях першай пяцігодкі і значэнне ўнутранай пазыкі „другога года 2-й пяцігодкі“, выпускаемай урадам СССР у суме 3,5 мільярда рублёў.

Агульны сход калектыва работнікаў АГМС адзначае, што сусветна-гістарычнае дасягненне ў вобласці соцыялістычнай прамысловасці і сельскай гаспадаркі першай пяцігодкі рабочым класам і працоўным сялянствам страны будуючагася соцыялізму дасягнуты пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і Ленінскага ЦК, на чале з правадыром сусветнага пролетарыята т. Сталіным. Наш Совецкі Саюз з краіны аграрнай з раздробленай аднаасобнай сельскай гаспадаркай перабудаваўся ў краіну індустрыяльную, з буйнейшай у свеце механізаванай сельскай гаспадаркай, з краіны цёмнай і непісьменнай становіцца краінаю пісьменнай і культурнай.

БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б на чале з тов. Гікало, з адсталай, прыгнечанай каланіяльнай страны ператварылася ў індустрыяльна-аграрную краіну, ліквідавала непісьменнасць, стварыла сець беларускіх, яўрэйскіх і польскіх школ, якія ахапілі 96% дзяцей дашкольнага ўзросту, і мае значныя дасягненні ў разгортванні вышэйшых вучэбных устаноў.

Задача другой пяцігодкі—пабудова бяскласавага соцыялістычнага грамадства—патрабуе вялікіх капітальных укладаў у нашу соцыялістычную гаспадарку і значнага напружання сіл і энергіі для выканання і перавыканання планаў другой пяцігодкі.

Мы, работнікі АГМС, вітаем пастанову ўраду аб выпуску пазыкі і абавязваемся: правесці падпіску на пазыку ў 2-дзенны тэрмін па цэнтральнаму апарату і па перыферыі да 1-га мая, з ахопам усіх работнікаў падпіскаю на месячны аклад зарплаты і вызываем на соцспаборніцтва ўвесь калектыў работнікаў Інст. соц. рэканструкцыі сел. гаспадаркі і работнікаў сваёй перыферыі.

Вынікі падпіскі на пазыку „Другой пяцігодкі“ (другі выпуск)

Па цэнтральнаму апарату:

1.	Бюро воднага кадастра	120,7%
2.	Геафізічная абсерваторыя	108,9%
3.	Менская мет. станцыя	108,2%
4.	Агульны сектар	108,0%
5.	Спецчастка	106,5%
6.	Аддзел гідралогіі	106,1%
7.	„ метэаралогіі	103,9%
8.	„ прагнозаў	101,9%
9.	Планава-фінансавы сектар	100,0%
	Падпіска па ўсяму цэнтр. апарату на	106,5%

Перадавікі ўдарнікі фінфронта па падпісцы на пазыку „Другой пяцігодкі“ (другі выпуск)

1.	Кайгародава Ю.	160,0%
2.	Граздова В.	133,3%
3.	Турцэвіч	133,3%
4.	Герман	125,0%
5.	Шулякоўскі	125,0%
6.	Марчанка	125,0%
7.	Багданчык	125,0%
8.	Харук	120,0%
9.	Олінскі	120,0%

Акрамя пералічаных, яшчэ многа таварышоў падпісаліся вышэй 100%.

Падпіска на пазыку па сеці на 28-IV-34 г.

1.	Мет. станцыя Сіроціна	20°,3%
2.	Гідраметрычная ст. Бабічы	109,5%
3.	" " Віцебск	109,0%
4.	Мет. станцыя Зазер'е	108,6%
5.	" " Жыткавічы	107,8%
6.	" " Калінкавічы	105,7%
7.	" " Дрыса	104,7%
8.	" " Людвінава	103,8%
9.	" " Крычаў	102,9%
10.	" " Віцебск	100,7%
11.	" " Ст.-Барысаў	100,0%
12.	" " Барысаў	100,0%
13.	" " Слуцк	100,0%
14.	" " Негарэлае	100,0%
15.	" " Лепель	100,0%
16.	" " Чэрыкаў	100,0%
17.	" " Марына Сосны	100,0%
18.	" " Асінаўка	100,0%
19.	Гідраметрыч. ст. Гомель	100,0%
20.	Мет. станцыя Горкі	99,5%
21.	" " Полацк	97,0%
22.	" " Марына-Горка	96,0%
23.	" " Бычыха	88,8%
24.	" " Турск	62,5%
25.	" " Орша	58,1%

Сінаптычны агляд за першую дэкаду красавіка.

Гэта дэкада характэрна перавагай яснага сухога надвор'я, з вялікім сутачным хістаннем тэмпературы, даходзячай ноччу да прымаразкаў.

Такое надвор'е абумоўлівалася тым, што вобласці высокага ціску рухаліся з Скандынавіі на Еўрапейскую тэрыторыю Саюза і ў сферу ўплыва гэтых вобласцей уваходзіць і БССР.

Цыкланічная дзейнасць адбываецца на крайнім поўдні Еўропы — на субтрапічным фронце. Другая серыя цыкланічнай дзейнасці адбываецца на арктычным фронце крайняй поўначы Еўропы ў раёне Шпіцбергена, Барэнцава і Карскага мораў.

Такая сітуацыя ўтрымліваецца да 6 красавіка, калі пачалося праходжанне цыклонаў з Цэнтральнай Еўропы на паўночны ўсход Еўрапейскай тэрыторыі Саюза. З праходжаннем гэтых цыклонаў і звязаны ападкі, якія 7 красавіка, часамі ў выглядзе снега, прайшлі па БССР.

У апошнія дні дэкады нязначная цыкланічная дзейнасць адбывалася ў гэтым-жа напрамку, але цэнтр яе быў некалькі паўночней БССР, ападкі ў асноўным не захаплялі нашай тэрыторыі.

Масы паветра, якія займалі тэрыторыю БССР, патрэбна характарызаваць у асноўным як кантынентальна-палярныя.

І. Рачыцкі.

Табліца вынікаў метэаралагічных наз

Клімат. раён	№№ па карце	Назва станцый	Тэмпература паветра: 1	2	3	4	5	6	7	8	9	10		Сярэдняя	Нармальн.	Максімальная	Мінімальная	Часло, калі нагляд. мінімум	Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	2	4	2	2	3	5	4	5	6	8	—	4	—	13	—5	4	67
	3	Полацак	2	5	3	2	4	5	4	4	6	8	—	4	3	12	—5	4	54
	—	Вялікія-Лукі	2	4	2	1	3	4	4	4	5	7	—	4	—	10	—4	1	51
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	0	4	2	1	3	4	3	—	5	8	—	4	2	12	—4	4	54
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	1	4	3	1	4	5	3	5	7	10	—	4	—	15	—4	4	57
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	1	3	4	2	4	5	3	5	7	11	—	5	3	16	—4	4	59
	16	Менск	0	3	4	2	5	5	2	5	8	11	—	5	3	17	—5	2	54
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	0	4	4	2	4	5	3	5	7	12	—	5	3	17	—3	2	58
	25	Асіпавічы	0	3	5	3	4	6	5	5	8	13	—	6	3	17	—4	2	46
	10	Орша	—	4	4	1	3	5	2	4	6	10	—	4	2	14	—4	1	57
	19	Горкі	0	4	3	1	2	4	2	3	5	9	—	3	2	12	—4	1	64
III. Цэнтральны (раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак	1	3	5	3	5	6	3	5	8	10	—	4	—	13	—4	8	63
	30	Мар.-Сосны	0	1	4	4	5	7	4	5	9	14	—	5	5	19	—4	8	56
	21	Магілеў	0	4	4	1	4	4	3	4	6	10	—	4	2	16	—3	1	54
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	1	3	3	2	3	5	4	3	6	10	—	4	3	13	—3	5	57
	71	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	1	2	5	2	3	5	5	5	8	10	—	4	3	15	—3	2	54
	32	Жлобін	1	3	5	3	4	5	5	6	8	8	—	5	4	14	—3	2	51
IV. Паўднёвы (нізінны)	33	Жыткавічы	0	2	5	4	6	7	6	7	9	14	—	6	5	20	—4	3	53
	37	Калінкавічы	—1	1	6	4	4	6	6	6	8	13	—	5	4	19	—5	2	67
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	0	2	5	3	4	6	6	6	7	13	—	5	4	17	—3	3	50
	35	Васілевічы	—1	1	5	3	4	6	6	5	7	13	—	5	4	16	—4	2	52
	40	Людвінава	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	5	—	—	—	—

ых назіранняў за 1—10 красавіка 1934 г.

Чысло, калі нагляд. мінімум	Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %	Тэмпература паверхні глебы: Максімал.	Тэмпература паверхні глебы: Мінімальн.	Чысло, калі нагляд. мінімум	Ападкі ў мм: 1	2	3	4	5	6	7	8	9	10		Сума	Метэаралагічная з'ява (у дужках адзначаны чыслы)
4	67	—	—	—	..	..	..	..	..	1.0	0.1	..	0.4	6.0	—	7.4	уман (10)
4	54	—	—	—	..	..	..	..	..	..	0.1	..	1.0	9.0	—	10.1	туман ?
1	51	21	—5	1	..	0.1	..	..	..	..	..	..	..	3.0	—	3.1	туман (8)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
4	54	27	—	—	..	..	..	..	..	..	1.0	..	1.0	8.0	..	10.0	—
4	57	—	—	—	..	..	..	..	..	0.1	..	..	0.1	1.0	—	1.2	туман (5), граза (9)
—	—	—	—	—	..	..	..	..	..	0.5	..	..	2.0	..	—	2.5	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
4	59	—	—	—	..	..	..	..	..	1.0	..	..	2.0	1.0	—	4.0	туман (8)
2	54	28	—7	5	..	..	..	..	..	1.0	0.2	..	5.0	0.3	—	6.5	туман (2)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
2	58	21	—2	5	..	..	..	..	..	1.0	1.0	..	4.0	1.0	—	7.0	граза (10
2	46	—	—	—	..	..	..	..	..	0.1	..	..	6.0	..	—	6.1	—
1	57	—	—6	4	0.1	..	..	..	..	..	0.1	0.1	1.0	8.0	—	9.3	туман (8)
1	64	18	—3	1	..	..	..	..	..	..	2.0	3.0	1.0	3.0	—	9.0	град (6), туман (9)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
8	63	12	—4	8	..	..	..	..	..	..	1.0	..	..	7.0	—	8.0	туман (8)
8	56	—	—6	2	..	..	..	..	..	0.1	0.1	..	7.0	0.1	—	7.3	навальніца (9)
1	54	—	—	—	..	..	..	..	..	..	1.0	..	1.0	1.0	—	3.0	туман (8)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
5	57	—	—	—	..	..	..	..	..	..	1.0	..	20	10.0	—	13 0	туман (4, 9)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
2	54	22	—4	2	..	..	..	..	..	..	2.0	..	12.0	1.0	—	15.0	—
2	51	—	—	—	..	..	..	..	..	..	2.0	..	13.0	5.0	—	20.0	—
3	53	—	—	—	..	0.1	..	..	..	0.1	0.1	..	3.0	0.1	—	3.4	туман (8, 4)
2	67	—	—	—	..	..	..	..	..	..	0.1	..	1.0	0.5	—	1.6	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	..	..	..	..	..	..	0.5	..	..	14.0	—	14.5	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
3	50	—	—	—	..	..	..	..	..	..	0.1	..	..	2.0	—	2.1	туман (7, 9)
2	52	—	—5	2	..	..	..	..	..	..	..	..	1.0	0.3	—	1.3	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—

Табліца вынікаў метэаралаг. назіранняў за 1—10 красавіка 1934 г.

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Перавaжаючы: Напрамак	Вецер: Перавaжаючы: Хуткасць	Вецер: З максім. хуткасцю: Напрамак	Вецер: З максім. хуткасцю: Хуткасць	Інсаляцыя ў % %	Сярэдняя воблачнасць у 10-бальнай сістэме: Агульная	Сярэдняя воблачнасць у 10-бальнай сістэме: Ніжняя	Сярэдні стан паверхавага пласта глебы (на глыб. 10—15 см)
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	SE	3	SE	10	—	3	3	мокрая
	3	Полацак	SE	4	S	—	—	6	3	»
	—	Вялікія Лукі	S	4	S	10	—	6	3	вільготная
	63	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	S	4	S	7	57	3	3	вільготная
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	S	4	E	7	—	6	3	вільготная
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	»
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	SE	2	S	10	—	3	3	»
	16	Менск	E	4	S	5	—	3	3	сухая
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	SE	4	SE	10	—	3	3	вільготная
	25	Асіпавічы	SE	4	NE	7	—	3	3	»
	10	Орша	S	2	S	4	—	6	3	мокрая
	19	Горкі	SE	2	SE	7	—	6	3	вільготная
III. Цэнтральны (раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак	SE	4	SE	10	—	6	3	—
	30	Мар'іна-Сосны	E	4	E	12	—	6	3	вільготная
	21	Магілеў	SE	4	E	10	—	6	3	»
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	E	3	NW	10	—	6	6	вільготная
	191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	NE	4	W	10	—	8	3	»
	32	Жлобін	SE	4	SE	7	—	6	3	»
IV. Паўднёвы (нізінны)	33	Жыткавічы	E	4	S	10	—	6	3	вільготная
	37	Калінкавічы	SE	4	SE	10	—	3	3	вільготная
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	мокрая
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	SE	4	SE	7	—	6	3	вільготная
	35	Васілевічы	SE	4	NE	10	52	6	3	вільготная
	40	Людвінава	—	—	—	—	—	—	—	—

Метэаралагічная характарыстыка за 1-10 красавіка 1934 г.

Сярэдне-сутачная тэмпература паветра ў гэтай дэкадзе мела наступны характар: у першы дзень яна хісталася ад -1^0 на поўдні БССР да $+2^0$ на поўначы. Пасля гэтага т-ра павышаецца і к канцу дэкады дасягае 8^0-14^0, прычым вышэй на паўднёвым захадзе і ніжэй на паўночным усходзе. Уздым тэмпературы на працягу дэкады быў няроўнамерны. Так, 4-га, а мясцамі і 7-га наглядалася некаторае зніжэнне да 1^0-2^0.

Сярэднія дэкадныя т-ры хісталіся ад 3^0 да 6^0, такім чынам яны былі прыблізна на 1^0-2^0 вышэй нармальнай.

Максімальныя т-ры хісталіся ў вельмі шырокіх межах, але ў большасці каля 15-17^0, мінімальныя т-ры хісталіся ад -3^0 да -5^0.

Ападкі размеркаваліся вельмі няроўнамерна. На большай частцы тэрыторыі рэспублікі выпала мала ападкаў—ад 1 да 10 мм. У невялікай частцы тэрыторыі ў раёне Чэрыкаў—Жлобін—Чачэрск выпалі даволі значныя колькасці ападкаў да 20 мм. На поўдні БССР выпала надзвычайна мала ападкаў, 1-2 мм. На працягу дэкады ападкі таксама выпадалі няроўнамерна. Уся першая яе палова была абсалютна сухая. З 6-га па 8-ае мясцамі выпадалі нязначныя, 9-га і 10-га мясцамі выпалі даволі вялікія ападкі.

Вятры пераважалі паўднёва-заходніх напрамкаў, сярэднія хуткасці іх хісталіся ад 2 да 4 м/сек.

Максімальныя хуткасці дасягалі 10-12 м/сек.

Воблачнасць хісталася ад 30 да 80% агульнага пакрыцця неба.

Н. Малішэўская.

Сельска-гаспадарчая гідраметэаралагічная характарыстыка за 1-ую дэкаду красавіка 1934 г.

Першая дэкада красавіка па ходу гідраметэаралагічнага рэжыма была досыць здавальняючай у сэнсе вытварэння розных сельска-гаспадарчых палявых работ, у прыватнасці разгортвання масавага севу ранніх яравых культур.

У параўнанні данай дэкады з першай дэкадай красавіка 1932 і 1933 г. г. маецца вялікая розніца.

У першую дэкаду красавіка 1932 г. вытвараліся падрыхтоўчыя працы да вясенняй пасеўнай кампаніі, таму што ў гэты час яшчэ адбывалася толькі снегатаянне.

Першая дэкада красавіка 1933 г., па руху надвор'я, была зусім неспрыяючая для разгортвання палявых работ—з 6-га па 10-ае ўключна назіралася пахаладанне з штодзенным выпадзеннем ападкаў, пераважна ў выглядзе снега.

Тэмпературны рэжым на працягу ўсей першай дэкады красавіка 1934 года трымаўся вышэй нормы на 1-3^0.

Масавы сеў ранніх яравых культур ахапіў усе раёны БССР.

Стан азімых к моманту выхада з-пад снега здавальняючы, што пацвярджаецца правадзімым доследваннем над азімымі на працягу зімы ў радзе пунктаў. Наглядаўшыяся ў асобныя дні гэтай дэкады паніжэнні тэмпературы да -2^0—5^0 на становішчы азімых пасеваў адмоўна не адбіліся.

С. Б. Орман.

Да пытання аб пастаноўцы гідраметрычных работ.

Прад'яўляемыя запатрабаванні з боку воднай гаспадаркі да гідралагічнага вывучэння рэк БССР у сучасны момант асабліва складаныя і вялікія.

Соўнарком БССР у сваёй пастанове ад 15-га красавіка 1934 г. аб пабудове сямі гідраэлектрычных станцый раённага значэння на р. р. Уле, Бесядзі, Віхры, Обаль, Дрысе, Проні і Гаражанцы паставіў перад аддзелам Гідралогіі ГК АГМС БССР канкрэтныя запатрабаванні: даць гідралагічныя характарыстыкі для гэтых водных аб'ектаў, у аснову якіх павінны быць пакладзены крывыя расходаў вады.

Для пабудовы крывых расходаў, неабходна непасрэднае вымярэнне расходаў, у тым ліку найбольш высокіх і самых нізкіх, каб цалкам ахапіць імі амплітуду хістанняў узроўняў вады. Вымяраныя расходы павінны адказваць такім двум запатрабаванням:

1) быць размешчанымі больш-менш роўнамерна па ўсёй амплітудзе, праз кожныя 15—20 см. (трэба мець дастатковую і неабходную колькасць вымяраных расходаў)

2) і павінны быць дакладна вымяраемы.

Гідралагічны аддзел ГК АГМС БССР (былы аддзел Гімеіна), хаця і набыў шматлікі матэрыял, але яго недастаткова, каб даць поўны і здавальняючы адказ на высунутыя пытанні з боку соцыялістычнай воднай гаспадаркі БССР. Пры разглядзе гідраметрычнага матэрыяла, як па вышэйпамянёным, так і па шмат іншым рэкам высветлілася, што не гледзячы на часам вялікую колькасць непасрэдна вымяраных расходаў, немагчыма пабудаваць крывыя расходаў, бо расходы звычайна ахапліваюць да 50% амплітуды. Для відавочнасці гэтага прыводзіцца табліца расходаў на памянёных рэках:

Рака	Пункт назіранняў	Год адчынення паста	Амплітуда ўзроўняў на пасту м.	Колькасць вымеран. расх. (агульн.)	Колькасць вым. зімов. расх.	Амплітуда ўзроўняў, ахопл. вымер. расходаў (метраў)	Проц. ахопа расходамі ад нагляд. амплітуды ўзр.
Ула	Мартынава	1/VI-31 г.	4,58	57	—	0,45	10%
„	Прамыслы	14/V-27 г.	6,07	9	—	0,54	9%
Дрыса	Цясты	1/VII-27 г.	10,89	61	—	1,97	18%
„	Дземехі	28/VIII-32 г.	0,64	6	—	0,03	5%
Вехра	Куравічы	1/X-31 г.	3,85	27	—	1,34	35%
Бесядзь	Кіевічы	15/VIII-32 г.	1,33	10	—	0,72	54%
„	Свяцілавічы	15/VIII-29 г.	3,56	13	—	0,59	17%
Проня	Яскар	30/VI-31 г.	4,06	23	—	1,65	40%
„	Каралёўка	13/V-31 г.	3,30	17	—	0,28	9%
Друць	Румок	28/VII-31 г.	3,20	11	—	0,12	4%
„	Чэчэвіцы	7/VI-32 г.	1,17	13	—	0,50	43%
Оболь	Ломаносава	17/VIII-28 г.	2,22	54	—	2,01	90%
„	Зуі	13/VI-31 г.	1,13	5	—	0,13	10%

З-за адсутнасці месца тут нельга прывесці такую-ж табліцу па ўсёй гідраметрычнай сеці БССР, але дастаткова і гэтага, каб атрымаць уражанне аб паўнаце тога гідраметрычнага матэрыялу, які набыты Гімеінам БССР, пачынаючы з 1925 г.

1. Такое становішча з'явілася вынікам адсутнасці планавання і чарговасці вывучэння водных аб'ектаў БССР, адсюль распыленне сіл і сродкаў па ўсёй гідрасеці і адсутнасць паўнаты ў гідраметрычных работах па важнейшых рэках БССР.

2. Адсутнасць увагі да работы гідраметрычнай сеці, у прыватнасці тэхнічныя работнікі на перыферыі былі прадстаўлены самі сабе. Належнага метадычнага кіраўніцтва імі з боку Гімеіна не наглядалася. Характэрна, напрыклад, што ў дырэктывах да палявых работнікаў і ў планах палявых работ усюды стаіць толькі лічба расходаў, а пры якіх гарызонтах трэба вымяраць іх, гэта не паказвалася. Веснавыя паводкі часта заставалі гідрометраў у расплох і прахадзілі, не захопленыя вымярэннем расходаў.

3. Акрамя таго бываюць выпадкі дэзарганізацыі работы, розныя ўстановы, як Белторф, Белводгас, Белрыба і іншыя, якія маючы на ўвазе прапускаць веснавыя воды, робяць заяўку Гідраметслужбе аб гэтым толькі перад самым паўнаводдзем, што безумоўна ўтварае паспешнасць падрыхтоўкі да вымераў расходаў і не дае магчымасці да іх падрыхтавацца. Характэрным прыкладам гэтага з'яўляецца заяўка Белторфа ў 1934 г., якая паступіла 16/III-34 г., а паводак пачаўся 17/III-34 г. Прышлося тэрмінова мабілізаваць работніка групы апрацоўкі і ў паспяховым парадку пасылаць яго на вымярэнне расходаў, не забяспечыўшы яго камплектам абсгалявання, якое было размеркавана раней для іншых работ.

Улічваючы вышэйпамянутыя недахопы і лічачы сваім галоўнейшым заданнем абслугоўванне соцыялістычнай воднай гаспадаркі, аддзел Гідралогіі па закранутаму пытанню перабудоўвае сваю работу наступным чынам:

1. Бярэцца асноўны ўпор на ўмацаванне работы гідраметрычнай сеці, яе рацыяналізацыю і ўмацаванне інжэнерна-тэхнічным персаналам за лік цэнтральнага апарата.

2. Уводзіцца чарговасць у вывучэнне водных аб'ектаў для сканцэнтравання сіл і сродкаў на важнейшых гідраметрычных пунктах і палепшання якасці вадамерных назіранняў і іх апрацоўкі.

3. Вытвараецца ўлік, на якіх водпастах і пры якіх гарызонтах трэба вымяраць расходы вады, каб не дубліраваць ужо праробленай працы і з максімальнай эканоміяй праводзіць толькі неабходныя работы, якія былі-б дастатковымі. З гэтага вынікае, што кожны загадчык гідраметрычнай станцыі павінен мець у сябе на станцыі ўсе вымераныя расходы і крывую расходаў з тым, каб пры складанні планаў і правядзенні гідраметрычных работ ведаць, колькі расходаў і пры якіх узроўнях неабходна вымяраць.

Калько.

Адказны рэдактар П. Мамаеў.

Члены рэдкалегіі: Ф. Рабаконь, А. Кайгарадаў, Б. Лісіцкі, І. Калько, І. Рачыцкі.

Друкарня БелАН. Зак. № 153. Гарліт № 2831 Тыраж 1000 экз. 9 стар.

Москва
Софийская Набережная
№ 38
Гидрометеорологическая
Станция У. Б. К.